# Раніца новага дня

То быў пачатак Вялікай Перамогі. Вяртанне да міру і жыцця. Ліс-тапад 1943 года. Гомель у руінах. Нямецкая армія чаплялася за кожны метр чужой зямлі, якая сыходзіла з-пад ног. Але савецкія часці з адчайным запалам чысцілі ад ворага прастору родных гарадоў і вёсак. 26 лістапада 1943 года пасля трох гадоў акупацыі і бязлітасных баёў Гомель стаў свабодны — першы сярод бела-рускіх гарадоў. На адной з напаўразбу-раных сцен тады з'явіўся надпіс: "Мы адродзім цябе, родны Гомель".

**СВОЙ ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ**

Раніцай 26 лістапада 2008 года на адной з цэнтральных вуліц Гомеля, капаю-чы траншэю, будаўнікі знайшлі... авія-цыйную бомбу часоў Вялікай Айчыннай. Так пачынаўся дзень 65 -гадовага юбілею — рэальным вяртаннем у мінулае.

— Тэта самае светлае свята, якое было і застаецца ў маім жыцці, — га-раджанка Соф'я Асіпкова ўсю вайну не пакідала Гомель, удзельнічаючы ў падпольным руху. — Сказаць шчаслі-выя — мала. Мы былі ўзрушаны, калі ў наша жыццё ўвайшло 26 лістапада, неверагоднай цаной выпрабаванняў і чалавечых страт.

На гарадскія Брацкія могілкі ў гэты дзень прыйшлі ўсе, хто мог. Напярэ-дадні падчас будаўнічых работ знайшлі астанкі савецкага афіцэра, які загінуў ў 1941 годзе. Побач ляжала запісная кніж-ка і некалькі гранат. Астанкі пахавалі — урачыста і па праваслаўных трады-Цыях, каб утрапёная душа, праз шэсць дзесяцігоддзяў, знайшла спачынак.

Малебен аб усіх загінуўшых у га-лоўным саборы горада — Пятра і Паўла, ускладанне кветак да месцаў памяці, сустрэчы з жывымі сведкамі тых падзей... Тое нямногае, чым быў



Зорку Героя Савецкага Саюза Іван Мартынаў атрымаў за фарсіраванне Одэра.

насычаны юбілейны дзень. Прыкаваў ён і ўвагу навукоўцаў, якія сабраліся

на міжнародную навукова-практыч-ную канферэнцыю "Старонкі ваеннай гісторыі Гомельнчыны".

— У мінулым Айчыны яшчэ ня-мала белых плям, — растлумачылі цікавасць ваенных гісторыкаў аргані-затары канферэнцыі. — Даследаванні працягваюцца і адкрываюць усё но-выя падзеі, раней мала вывучаныя або зусім невядомыя.

Магчыма, калі-небудзь у рабоце гэ-тай канферэнцыі, якая абяцае стаць традыцыйнай, возьмуць удзел вучні гарад-ской сярэдняй школы № 2. Пакуль жа яны заняты ў малых даследчых працах, вынікам якіх стала адкрыццё 26 ліста-пада унікальнага школьнага музея. У ім — аб гісторыі школы праз падзеі Вялі-кай Айчыннай вайны. І гэта не выпадко-ва, бо сярод былых вучняў і работнікаў школы — Героі Савецкага Саюза Георгій Склязнёў, Іван Каленікаў, Барыс Калач.

## Жывыя ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ

Іван Мартынаў павольна спускаец-ца па ступеньках. Дэмісезонная куртка, шэрага фетру шляпа. 3 выгляду

— звычайны пенсіянер, якіх у горадзе

сустракаеш нямала. Але я ведаю, што ён — той самы Герой нашага часу.

— Колькі разоў я бываў у Гомелі?

— мы пад руку ідзём у Гомельскі абласны музей ваеннай славы. — Значыць, першы — у лістападзе 43, падчас Гомельска-Рэчыцкай аперацыі, калі "чысцілі" гэту зямлю. Потым ужо пасля вайны на 50-годцзе вызвалення, 60-годдзе і цяпер вось на 65-годдзе. Хто 6 мог падумаць, што дацягну... А горад — прыгажун. Ён жа ў руінах стаяў. Не было да каго пастукаць у дзверы, каб прысесці і перадыхнуць.

На юбілей з Масквы генерал-лей-тэнант у запасе Мартынаў прыехаў разам з пяццю таварышамі па 121-й Гомельскай гвардзейскай стралковай дывізіі, якой горад, па сутнасці, і аба-вязаны першым днём мірнага жыцця

— 26 лістапада 1943 го^а. Асобны суп-рацьтанкавы артылерыйскі дывізіён, якім камандаваў 20-гадовы Мартынаў, рухаўся па паўночна-ўсходняй мяжы гомельскай зямлі, выпіхваючы нямец-кія часці, якія былі гатовы ўцякаць, але адчайна хапаліся за шанс выжыць.

— А за што зорка Героя Савецкага Саюза? — хочацца пачуць яго галоў-ную гісторыю.

— Гэта за фарсіраванне Одэра. А вось ордэн Аляксандра Неўскага я атрымаў за атаку пад Літвіновічамі Гомельскай вобласці. Там цяжка прыйш-лося, але ўзялі мы вёсачку.

— Няўжо самі паднімалі салдат?

— па фільмах я ўяўляю сабе гэты неча-лавечы парыў, але вось па жыцці — з цяжкасцю: устаць, каб памерці...

— Я ж камандзір, — тлумачыць мне ветэран. — Шэсць атак у мяне за ўсю вайну было. Але ведаеш, дагэтуль не магу зразумець гэтай неверагоднай моцы "ура" Пакуль няма яго, розум працуе, трымае інстынкт самазахаваня. Але толькі пракрычаў — усё ад-ключаецца. Нічога ўжо не адчуваеш. Страчваеш усведамленне рэальнасці і рухаешея наперад — пад кулямі, уру-капашную. Я пад Літвіновічамі моцна паранены быў — разрыўная ў бядро. Адваляўся пару месяцаў — і наперад.

Іван Пятровіч водзіць мяне па музе! — ад "шкла" да "шкла" за якім для яго значна больш, чым мінулае. Гаво-рыць і са мною, і з сабою.

— Сапраўды, гімйасцёрка амаль як мая. І падобны кіцель дзесьці ў шафе ляжыць. А гэта здымкі разбуранага Гомеля і вёсак? Зусім мала помню. Ах ты, Божа мой, ды вось жародненькая 76-міліметровая дывізіённая гармата — "ЗІС-3, дзетка, канструкцыі Грабіна", якую ў лямках адцягаў. Дзе конік не пройдзе, ба-лоцістае месца, мы запрагаліся — і куды трэба. Яна ж малайчынка. Гавораць, і ў Францыі ў нейкім музеі стаіць як адзін з лепшых узораў узбраення. Міш, коль-кі я падбіў ёю танкаў? — кліча з іншага канца залы Міхаіла Іванавіча Захарава, старшыню ветэранскай арганізацыі 121 гвардзейскай стралковай дывізіі.

— 86, Ваня...

## МіНУЛАЕ ДЛЯ БУДУЧЫНІ

У абласным музеі ваеннай славы ў гэтыя дні мнагалюдна як ніколі. Шмат моладзі, шмат пажылых гасцей.

— Наш музей, перш заўсё, раскрывав тэму абароны Бацькаўшчыны, — невялікі экскурс для мяне робіць дырэктар Павел Ждановіч. — Праз экспазіцыі можна прасачыць вайну як з’яву — ад часоў радзімічаў і да сучаснасці. Аднак галоўны акцэнт, вядома ж, зроблены на тэме Вялікай Айчыннай вайны. Яна прадстаўлена як у экспазіцыях, так і вы-ставай тэхнікі пад адкрьггым небам.

Верталёт, самалёт, “цяплушка”, гар-маты-“саракапяткі”, знакамітая “Кацюша”, паўтаратонка — тое, да чаго можна дакрануцца... А ў залах праз дакумен-ты, фота, зброю і рэчы раскрываюцца падзеі ваеннай эпохі. Тут прадстаўлены багаты матэрыял аб вядомых палка-водцах Ракасоўскім, Гарбатаве, Батаве, Жукаве, героях вайны — братах Лі-зюковых. Праліваецца новае святло і на ўжо вядомыя факты. Так, менавіта падчас бітваў пад Гомелем дзеючая ар-мія ўпершыню прымяніла запальную сумесь супраць танкаў. Генерал-лейтэ-нант Андрэй Яроменка, зразумеўшы сілу нямецкіх танкавых атак, загадаў на складзе ў Гомелі напоўніць саставам КС (сумессю бензіну і рэчываў, што ўтрым-ліваюць фосфар) 10 тысяч шкляных вінных бутэлек, якія фашысты пазней назвалі “кактэйлем Молатава”. Такая самаробная “граната” была знойдзена падчас будаўнічых работ на цэнтраль-най плошчы горада... У музейных экспазіцылх можна ўбачыць і іншыя рары-тэты. Напрыклад, пляшку Гітлера. Па словах сведкі, гэты трафей быў знойдзе-ны ў гітлераўскім бункеры ўдзельнікам штурму Берліна гамяльчанінам Мань-ковым і цалкам мог служыць фюрэру да таго моманту, пакуль у Германію не прыйшлі савецкія салдаты.



Аб тым, што ўсё гэта не проста цікава, а вельмі цікава не толькі бе-ларусам, гавораць усе новыя праекты ваенна-патрыятычнай тэмы. Апошні — у 65-годдзе вызвалення — і вы-рашылі рэалізаваць Гомель і яго горад-пабрацім шатландскі Абердзін. У сценах музея ўпершыню адкрылася выстава, якая знаёміць з ваеннай гіс-торыяй Шатландыі:

— Мы прывезлі лепшыя экспазі-цыі абердзінскага музея каралеўскага шатландскага палка імя Гордана Хай-ландэра, — прэзентаваў выставу мэр Абердзіна Пітэр Стывен. — Гэта зрэз 200-гадовай гісторыі Бацькаўшчыны, у ёй і старонкі другой сусветнай вайны. Вядома, Шатландыя не біла так моцна разбурана, як Беларусь. Мы не страцілі столькі людзей, але нашы людзі смуткуюць разам з вамі. А нашы дзеці павінны засвоіць, што паўтору падобнага быць не павінна...